# ДАСЛЕДЧАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*Крац Ірына Дзмітрыеўна*

УА «Брэсцкі дзяржаны ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна»

Даследчая дзейнасць вучняў становіцца ўсё больш актуальнай у сучаснай педагогіцы. Гэтыя змены прадыктаваны самім жыццём, развіццём педагагічных тэхналогій, якія маюць справу з фарміраваннем у вучняў здольнасці самастойна думаць, назапашваць і выкарыстоўваць веды, дасканала прадумваць рашэнні і дакладна планаваць дзеянні. Менавіа ў працэсе самастойнай даследчай працы лепш за ўсё фарміруецца культура разумовай працы вучняў, уменне самастойна здабываць веды.

Вучэбна-даследчая дзейнасць вучняў – гэта такая арганізацыя працы, якая звязана з рашэннем вучнямі творчай, даследчай задачы з загадзя невядомым вынікам і прадугледжвае наяўнасць асноўных этапаў, характэрных для навуковага даследавання: пастаноўку праблемы, знаёмства з літаратурай па праблеме, авалоданне методыкай даследавання, збор уласнага матэрыялу і яго аналіз, абагульненне і вывады, прадстаўленне вынікаў.

Усяму гэтаму неабходна навучыць дзяцей, і пажадана не падчас падрыхтоўкі канкрэтнага праекта ці даследчай працы, а загадзя, у працэсе навучання беларускай мове. Вось чаму сёння актуальныя ўрокі, якія фарміруюць даследчую культуру.

Спынімся на вопыце арганізацыі гэтай дзейнасці ў пачатковай школе. Звычайна даследаванні асацыіруюць з вопытамі, эксперыментамі, якія можна правесш ў пачатковых класах на ўроках «Чалавек і свет», аднак змест гуманітарных прадметаў таксама адкрывае шырокія магчымасці для развіцця даследчых навыкаў вучняў.

З педагагічнага пункту погляду няважна, ці змяшчае дзіцячае даследаванне прынцыпова новую інфармацыю, ці даследчык-пачаткоўца адкрывае ўжо вядомае. Тут галоўнае – даследчы вопыт.

Вялікія магчымасці для фарміравання ў малодшых школьнікаў азоў даследчай дзейнасці ў галіне мовазнаўства дае знаёмства з этымалогіяй [1].

Можна вылучыць наступныя накірункі працы над этымалогіяй слова ў пачатковай школе:

– этымалогія імён уласных (антрапонімаў);
– тапаніміка роднага краю;
– даследаванне гідронімаў;
– этымалогія і семантыка слоў на ўроках беларускай мовы і літаратурнага чытання;

– этымалогія фразеалагізмаў, прыказак і прымавак беларускай мовы і інш.

Багатую глебу для першых этымалагічных даследаванняў даюць тэмы, якія знаёмяць малодшых школьнікаў з напісаннем уласных імён. На такіх уроках у настаўніка ёсць магчымасць пазнаёміць вучняў з паходжаннем іх імён і прозвішчаў, назваў геаграфічных аб’ектаў роднага краю. Веды такога кшталту вельмі значымыя для вучняў, так як размова вядзецца пра іх імёны, пра родныя вуліцу горада, дзе яны жывуць.

Ужо на першых уроках навучання грамаце першакласнікам можна прапанаваць даведацца не толькі пра тое, як з’явіліся словы, напрыклад, аловак, воўк, певень, але і адкуль прыйшлі іх імёны, што яны абазначаюць. Гэта падвядзе дзяцей да неабходнасці правядзення даследчай працы па вывучэнні гісторыі свайго імені.

Пазней, вывучаючы тэму «Вялікая літара ў прозвішчах, імёнах людзей» будзе лагічным правесці працу па вывучэнні этымалогіі прозвішчаў, імёнаў імёнаў па бацьку.

Вялікае выхаваўчае значэнне мае вучэбна-даследчая праца вучняў, заснаваная на матэрыяле, які знаёміць іх з тапанімікай роднага краю.

Зварот да мікратапонімаў – назваў унутрыгарадскіх аб’ектаў, вуліц, плошчаў, бульвараў і г. д. – адкрывае шырокія магчымасці для правядзення малодшымі школьнікамі першых індывіуальных даследчых прац.

Даследчая дзейнасць малодшых школьнікаў на аснове этымалагічнага аналізу фразеалагізмаў можа ўжо праводзіцца на ўроках фарміравання графічнага навыку.

Так, напрыклад, на ўроку ў 1 класе «Вялікая літара *Ф*» настаўнік можа падштурхнуць дзяцей да пачатку этымалагічнага аналізу фразеалагізмаў.

– Што агульнага ў слоў фіялка, фламінга? (пачынаюцца з літары *ф*, з’яўляюцца назоўнікамі).

І не толькі. Што ж яшчэ агульнага? Ставіцца мэта: знайсці яшчэ адну агульную прымету.

– Як можна гэта зрабіць? Запытаць у іншых. (Дзеці аб’ядноўваюцца ў групы, адна з груп з звяртаецца да энцыклапедыі, слоўнікаў). Астатнім групам настаўнік прапануе пазнаёміцца з наступнымі тэкстамі:

*Тэкст 1.* Аказваецца, такая знаёмая нам літара «Ф» сапраўды з’яўляецца «чужынкай». І калісьці яе проста не было ў алфавіце. Можна нават вывесці простае правіла: калі слова пачынаецца на гэтую літару, значыць, яно запазычанае.

*Тэкст 2.* Раней кожная літара называлася для зручнасці запамінання якім-небудзь словам: *А* назвалася «аз», г. зн. «Я»; *Л* – «людзі», а літара «Ф» насіла назву «ферт», сэн якога застаўся няясным.

*Тэкст 3.* Пастава ганарлівага чалавека з рукамі, пастаўленымі на пояс, падобная да літары «Ф». Існуе фразеалагічная адзінка *глядзець фертам* ‘мець самаздаволены выгляд’, характарызуе самаздаволенага, фарсістага і франтаватага чалавек чалавека.

– Дык што агульнага ў слоў *фіялка, фламінга*? (Гэта запазычаныя словы).

– Што новага даведаліся? Шпо абазначае ўстойлівы выраз *глядзець фертам*, калі так гавораць?

Цяпер у вучняў з літарай «Ф» звязана а цэлая гісторыя.

Наступны крок – фарміраванне даследчага вопыту малодшых школьнікаў пры вывучэнні часцін мовы, роднасных слоў.

Заданне: Падкрэсліце роднасныя словы. Якое слова лішняе?

*Нос, пераносіца, насавы, паднос*; *горад, узгорак, гарадок, гарадскі.*

З мэтай фарміравання ў вучняў здольнасці самастойна, творча асвойваць новыя спосабы дзейнасці карысна праводзіць даследчую працу над словам.

У 1–2 класе праца над словам праводзіцца франтальна. На ўроку збіраецца ўся інфармацыя пра слова. На наступных занятках у кожнага вучня свая старонка слоўніка, якую ён рыхтуе дома самастойна.

У 3–4 класах вучні працуюць самастойна, збіраючы ўсю інфармацыю пра слова. Напрыклад, даследуючы слова *дружба*, вучні падбіраюць і складаюць загадкі, прыдумваюць крыжаванкі, збіраюць прыказкі і прымаўкі, вершы і песні.

Так крок за крокам у вучняў фарміруюцца важныя даследчыя ўменні: граматна сфармуляваць праблему, гіпотэзу, паставіць мэту, працаваць з навуковай і даведачнай літаратурай, вычляняючы з тэкстаў патрэбную інфармацыю, правесці апытанне, параўнаць вынікі, зрабіць вывады.

Пры правільнай арганізацыі даследчая дзейнасць стварае ўмовы для інтэлектуальнага, творчага, асобаснага развіцця вучняў. Яна накіравана на фарміраванне ў вучняў якасна новых каштоўнасцяў на аснове самастойнага набыцця новых ведаў, уменняў і навыкаў, значымых для іх на даным этапе развіцця.

Такім чынам, даследчая дзейнасць у пачатковай школе павінна праводзіцца сістэмна, з улікам узроставых асаблівасцяў малодшых школьнікаў.

Спіс выкарыстанай літаратуры

1. Орлов, Ю. И. Этимологический анализ слова / Ю. И. Орлов // Начальная школа. – 2002. – № 1.